сакрысціямі накрыты 2-схільным дахам з сігнатуркай над апсідай. На гал. фасадзе 3-ярусная (васьмярык на чацверыку) вежа-званіца (пабудавана ў 1920), завершаная шатром. Фасады прарэзаны стральчатымі аконнымі праёмамі і нішамі. Паліхромія фасадаў падкрэслена атынкаванымі архіт. элементамі — прафіляванымі ліштвамі, вуглавымі лапаткамі, карнізамі. Унутраная прастора перакрыта плоскай, абшытай дошкамі столлю. У інтэр'еры гал. алтар з насценным роспісам і бакавыя разныя алтары вырашаны з выкарыстаннем ордэрных элементаў. Над уваходам размешчаны арган. Перад храмам — трохпралётная арачная брама. Касцёл дзейнічае. *А.М.Каласоўская.*

**ГЕРМА́НСКІЯ МО́ВЫ**, група роднасных моў заходняга арэала індаеўрап. моўнай сям'і. Пашыраны ў краінах Зах. Еўропы (Вялікабрытанія, Германія, Аўстрыя, Нідэрланды, Бельгія, Люксембург, Швейцарыя, Данія, Швецыя, Галандыя, Нарвегія), Паўн. Амерыкі (ЗША, Канада), Азіі (Індыя), Аўстраліі, Новай Зеландыі, паўд. Афрыкі (Паўд.-Афрыканская Рэспубліка і інш.). Г.м. ў свеце карыстаецца больш за 550 млн. чал. Вылучаюць 3 групы: паўн.-германскую, або скандынаўскую (дацкая, шведская, нарвежская, ісландская, фарэрская мовы), зах.-германскую (англ., ням., нідэрландская, фламандская, фрызская, люксембургская, афрыкаанс, ідыш) і ўсх.-германскую (гоцкая, бургундская, вандальская, гепідская, герульская — мёртвыя мовы). У сувязі з пастаянным узаемадзеяннем Г.м. паміж сабой іх сучасная генетычная класіфікацыя істотна адрозніваецца ад гіст. Так, скандынаўская група гістарычна складалася з зах. (нарвежская, ісландская, фарэрская) і ўсх. (дацкая, шведская) падгруп. У цяперашні час, у выніку ўзаемнага пранікнення моў, паўн.-германская група падзяляецца на кантынентальную (шведская, нарвежская, дацкая) і астраўную (фарэрская, ісландская) падгрупы. Ад зах.-германскіх моў граматычна і лексічна адасобілася англ. мова; яе носьбіты цалкам страцілі разуменне з носьбітамі інш. зах.-германскіх моў. У гісторыі фарміравання Г.м. адрозніваюць некалькі перыядаў: стараж. (ад узнікнення пісьменнасці да 11 ст.) — станаўленне асобных моў, сярэдні (12—15 ст.) — развіццё пісьменнасці на Г.м. і пашырэнне іх сац. функцый, новы (з 16 ст. да нашага часу) — фарміраванне і нармалізацыя нац. моў. Найб. стараж. помнікі германскага пісьменства выкананы рунічным пісьмом (8—9 ст.) і гоцкім алфавітам (4 ст.). Пісьмо на лац. аснове — з 7 ст. ў Англіі, з 8 ст. ў Германіі, з канца 11 ст. ў Ісландыі і Нарвегіі, з канца 13 ст. ў Швецыі і Даніі. Працэс фарміравання нац. літ. моў завяршыўся ў Англіі ў 16—17 ст., у скандынаўскіх краінах у 16 ст., у Германіі ў 18 ст. Пашырэнне англ. мовы за межы Англіі прывяло да ўзнікнення яе варыянтаў у ЗША, Канадзе, Аўстраліі і інш. Ням. мова ў Аўстрыі і Швейцарыі прадстаўлена яе аўстрыйскім і швейцарскім варыянтамі. Г.м. даследуюць бел. лінгвісты Д.Г.Багушэвіч, Т.С.Глушак, Л.М.Ляшчова, Г.А.Мятлюк, Т.В.Паплаўская, З.А.Харытончык і інш.

*Літ.*: Атлас языков мира: происхождение и развитие языков во всем мире. М., 1998; Берков В.П. Современные германские языки. М., 2001; Введение в германскую филологию. М., 2006; Рагаўцоў В.І. Мовы свету: энцыкл. давед. Магілёў, 2009. *Д.В.Дзятко.*

**ГЕРМЕНЕ́ЎТЫКА** (ад. грэч. hermeneutikos тлумачальны, меркавальны), майстэрства тлумачэння складаных шматзначных тэкстаў. Этымалогія слова Г. ўзыходзіць да імя Гермеса — у антычнай міфалогіі вясніка вышэйшых багоў, які трактаваў і тлумачыў перададзеныя звесткі, а таксама нібыта вынайшаў мову і пісьменнасць. Значэнне Г. вызначаецца патрэбай у разуменні тэкстаў культуры і распрацоўцы прынцыпаў іх інтэрпрэтавання. Г. арыентавана на высвятленне незразумелых з'яў культуры. Майстэрства Г. ўзнікла ў антычнасці, мела сакральны характар і было звязана з тлумачэннем выказванняў аракула, пазбаўленых прамога адказу, але пададзеных іншасказальна. Вытокі Г. таксама ўзыходзяць да эгзегетыкі Бібліі (тэалагічнай Г.), якая склалася як дапаможная багаслоўская дысцыпліна. Раннехрысціянская экзегетыка прадстаўлена александрыйскай і антыяхійскай школамі, дзе першая імкнулася больш да алегарычнай трактоўкі Бібліі, а другая — да філал. і гіст. інтэрпрэтацыі. Шмат прыкладаў германеўтычнай інтэрпрэтацыі Бібліі можна знайсці ў Ф.Скарыны, С.Буднага і інш. прадстаўнікоў бел. думкі. Фарміраванню Г. значна паспрыяла «рамантычная Г.» 19 ст., да якой належаць Г. ўніверсальная Ф.Шлеермахера (1768—1834) і Г. гіст. В.Дзільтэя (1833—1911). Італьян. гісторык права Э.Бэці (1890—1968) надаў далейшае развіццё прынцыпам Г., сфармуляваў яе законы. У творах Э.Гусерля (1859—1938), Т.Ліпса (1851—1914), М.Хайдэгера (1889—1976) пашырыліся веды аб філас. Г., якая ўсталявалася як сучасная навука ў творах Г.Гадамера (1900—2002), а ў франц. філасофа П.Рыкёра (1913—2005) займела своеасаблівую існасць. Як мастацтва і тэорыя тлумачэння тэкстаў Г. ўжываецца ў розных галінах ведаў: філасофіі, філалогіі, гісторыі, псіхалогіі, правазнаўстве. У 20 ст. пачала разглядацца як кірунак у філасофіі і гуманітарных навуках, які разглядае разуменне як умову асэнсавання сац. быцця. У эстэтычным кантэксце Г. разумеецца як вучэнне аб трактаванні маст. твора, высвятленне яго сапраўднага сэнсу і разуменне зместу. Бел. аўтары (Х.Гафараў і інш.) у сваіх творах таксама распрацоўваюць праблематыку гіст. і сучаснага развіцця Г.

*Літ.*: Бетти Э. Герменевтика как общая методология наук о духе. М., 2011; Гадамер Х.-Г. Истина и метод. Основы философской герменевтики. М., 1988;



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гафаров Х.С. Философская герменевтика Ханса-Георга Гадамера. Минск, 2003. *В.Р.Языковіч.*

**ГЕРО́Й** літаратурны, вобраз чалавека ў мастацкім творы. Часта ўжываецца ў значэнні «персанаж», «дзеючая асоба». Дадатковае сэнсавае значэнне, якое звязана са зместам слова «герой», — станоўчая дамінанта ў характарыстыцы персанажа. Таму адмоўных персанажаў, асабліва калі яны з'яўляюцца носьбітамі антыгуманных, чалавеканенавісніцкіх ідэй, называюць антыгероямі (антыгероі аповесці «Карнікі» А.Адамовіча). Сустракаюцца творы, Г. якіх выступаюць прадстаўнікі жывёльнага і расліннага свету (конь Булана ў аднайм. апавяданні К.Чорнага, сабака Джукі ў апавяданні «Львы» І.Пташнікава). Літ. жанры, у аснове якіх ляжыць *алегорыя* (байка, казка), падразумяваюць менавіта такіх Г.

*Т.К.Грамадчанка.*

**ГЕ́РСА**, пад'ёмныя металічныя ці акаваныя жалезам дубовыя краты, якія дадаткова зачынялі праём вежы-брамы. Важны элемент абароны замка, *дзяцінца* і інш. Прыкрывала дашчаныя вароты, падымалася і апускалася на ланцугах пад'ёмным механізмам у праёме брамы. Ніжнія канцы кратаў былі завостраны і ўваходзілі ў спец. гнёзды. Звонку Г. часта засланялася пад'ёмным мостам. У еўрап. замках Г. паявіліся ў сярэдзіне 15 ст., у Беларусі — у канцы 15 — пач. 16 ст. (*Мірскі замкавы комплекс, Мураванкаўская царква Раства Багародзіцы, Сынкавіцкая царква-крэпасць*).

**ГЕ́РУС** Сямён Пятровіч (21.11.1925, б. хутар Кунічна, Навагрудскі р-н — 23.2.1998), беларускі графік, педагог. Скончыў Вільнюскі маст. ін-т (1952). У 1953—67 выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це (да 1957 заг. кафедры). Выканаў эстампы ў тэхніках лінагравюры, літаграфіі, афорта і малюнка. Аўтар жанрава-тэматычных кампазіцый «Будаўнік Мінска» (1958), «Мы — беларусы» (1968), «Маё дзяцінства» (1970), «Янка Купала ў Вязынцы» (1982), партрэтаў К.Каліноўскага (1953), Ф.Скарыны (1954), П.Броўкі (1964), М.Танка (1975), Я.Коласа, (1982), серыі эстампаў і малюнкаў, прысвечаных Мінску (1960—70, 1990). *Б.А.Лазука.*



*С.Герус. Кастусь Каліноўскі. 1953.*

**ГЕ́РЦЭН** Аляксандр Іванавіч (6.4.1812, Масква — 21.1.1870), рускі пісьменнік, публіцыст, філосаф. Скончыў Маскоўскі ун-т (1833), дзе разам з М.П.Агаровым узначальваў рэв. гурток. У 1834 арыштаваны, 6 гадоў правёў у ссылцы. З 1842 у Маскве. З 1847 у эміграцыі. Распрацаваў тэорыю «рускага сацыялізму», стаў адным з пачынальнікаў народніцтва. У 1853 заснаваў у Лондане Вольную рус. друкарню, выдаваў альманах «Полярная звезда» (1855—68) і час. «Колокол» (1857—67). Садзейнічаў стварэнню тайнай рэв. арг-цыі «Зямля і воля», падтрымліваў паўстанне 1863—64 у Польшчы, Беларусі і Літве, нац.-вызваленчы рух у Беларусі і Літве, выступаў за нац. самавызначэнне беларусаў. Аўтар рамана «Хто вінаваты?» (ч. 1—2, 1841—46), аповесцей «Доктар Крупаў» (1847), «Сарока-злодзейка» (1848), кн. мемуараў «Былое і думы» (1852—68). Народніцкія і рэв.-дэмакр. ідэі Г. паўплывалі на станаўленне светапогляду Ф.Багушэвіча, А.Гурыновіча і інш. бел. пісьменнікаў. Выданні Вольнай рус. друкарні распаўсюджваліся ў Беларусі, газ. «Колокол» пісала пра бяспраўнае становішча бел. сялянства, дэспатызм памешчыкаў, арміі і ўрадавай бюракратыі (1858, № 27; 1860, № 64 і 76; 1861, № 128—130, 141 і інш.), вітала «Мужыцкую праўду» К.Каліноўскага. У перакладзе на бел. мову выдадзены кн. «Былое і думы» (т. 1, ч. 1—2, 1940), раман «Хто вінаваты?», аповесці «Сарока-злодзейка», «Доктар Крупаў» і інш. (у кн. «Мастацкія творы», 1941).

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—30. М., 1954—66.

*Літ.*: Кісялёў Г. З думай пра Беларусь. М., 1966. Д.Л.Башкіраў.

**ГЕРШО́ВІЧ** Юрый Вульфавіч (10.1.1935, г. Харкаў, Украіна — 15.5.2010), беларускі скрыпач. Засл. артыст Беларусі (1980). Скончыў Харкаўскую кансерваторыю (1959). У 1959—95 саліст Дзярж. акадэмічнага сімф. аркестра Беларусі (з 1972 канцэртмайстар), адначасова ў 1965—72 выкладаў у спец. муз. школе пры Бел. акадэміі. Выступаў як саліст і ансамбліст (у 1965—90 — 1-я скрыпка Квартэта Саюза кампазітараў Беларусі).

**ГЕРШО́НСКАЯ ЦАРКВА́ РАСТВА́ БАГАРО́ДЗІЦЫ**, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю ў в. Гершоны Брэсцкага р-на. Пабудавана ў 1866—69 з цэглы. Да асн. прамавугольнага ў плане аб'ёму прымыкаюць 5-гранная апсіда, трапезная, званіца, бакавыя рызніца і ахвярнік Дамінантамі храма з'яўляюцца 2-ярусная шатровая званіца (васьмярык на чацверыку) з цыбулепадобнай галоўкай у завяршэнні і такі ж купалок на 4-схільным даху асн. аб'ёму. Бакавыя фасады прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі, званіца — лучковымі. У вонкавым аздабленні выкарыстаны аркатурныя паясы, лапаткі, прафіляваныя прамавугольныя і арачныя нішы. Дэкар. дэталі атынкаваны і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ